ЛИТЕРАТУРА:

1. Каган М.С. Философская теория ценности. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1997. – 205 с.

2. Киселева Т.Г., Красильников Ю.Д. Основы социально-культурной деятельности: Учеб. пособие. – М.: МГУК, 1995. – 135 с.

3. Культурно-досуговая деятельность / Под ред. А.Д.Жаркова и В.М.Чижикова. — М.: Моск.гос.ун-т культуры и искусств, 1998. — 462 с.

4. Марков А.П., Бирженюк Г.М. Основы социокультурного проектирования. Учебное пособие. – СПб.: СПГУП, 1997. – 230 с.

5. Современная молодёжь в аспекте социальных, психолого-педагогических и правовых проблем / Тез. докл. на междунар. науч.-практ. конфер. (6-7 февраля 1996 г.) – Минск, 1996. – 200 с.

6. Ученые записки / Под ред. Т.Г.Киселевой, В.И.Черниченко, Н.Н.Ярошенко – М.: МГУКИ, 2001 – 203 с.

7. Цзен Н., Пахомов Ю. Психотренинг: игры и упражнения. – М.: Класс, 1999. – 272 с.

*Рабава А.В.*

## КУЛЬТУРА ЯК ФАКТАР ТУРЫСЦКАЙ МАТЫВАЦЫІ

Колькасныя і якасныя змяненні ў міжнародным турызме за апошняе паўстагоддзе сведчаць пра непазбежнае ўзрастанне значнасці сацыяльных і культурных фактараў, якія становяцца ключом да выра-шэння праблем сучаснага турызму і абменаў як часткі працэсу адраджэння сацыяльна - культурных каштоўнасцей у свеце. Турызм адыгрывае актыўную ролю ў стварэнні новай цывілізацыі, пра што гаворыцца ў Манільскай дэкларацыі па сусветнаму турызму: «У практыцы турызму духоўныя каштоўнасці павінны пераважаць над элементамі матэрыяльнага і тэхнічнага характару».[1]

У гэтай сувязі мэтазгодна вызначыць сацыяльны, культурны і адукацыйны аспекты ўплыву турызму на развіцце грамадства.

Сацыяльны ўплыў турызму - гэта ўплыў, які аказвае турызм на грамадскі лад, грамадскія інстытуты, адносіны ў грамадстве.

Культурны і адукацыйны аспекты ўплыву турызму маюць непасрэдныя адносіны як да сферы матэрыяльнай вытворчасці, так і да сацыяльнай сферы, перш за ўсе, да сістэмы каштоўнасцей, кругагляду і грамадскіх паводзінаў людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На падставах вывучэння спецыялізаванай літаратуры і вопыту работы айчынных турысцкіх арганізацый можна меркаваць, што колькасць міграцый грамадзян з культурнымі каштоўнасцямі пакуль яшчэ складае адносна невялікую частку ад агульнай колькасці турысцкіх падарожжаў, але яны набываюць ўсе большае значэнне і аказваюць узмацняючае ўздзеянне на характар, масавасць і даступнасць культурных абменаў.

Устойлівае развіцце сацыяльнага і маладзежнага турызму, высокія тэмпы штогадовага росту ( у сярэднім 10-12% у 60-80 гг. XX ст.), яго сацыяльна - культурная накіраванасць зламалі стрыманыя адносіны да яго з боку большасці дзяржаў, заставілі іх у пачатку 80-х гг. XX ст. адмовіцца ад падыходу, які складаўся апошнія дзесяцігоддзі, да турызму як да чыста камерцыйнай з'явы. Паступова пераадольваецца стэрэатып прыватнага прадпрыймальніцтва, абсалютнага прыярытэту прыбытковасці над задавальненнем пазнавальных запатрабаванняў турыстаў. Гэта тэндэнцыя яшчэ недастаткова праяўляецца ў нашай рэспубліцы, але з улікам развіцця турыстычнай справы, вострай канкурэнтнай барацьбы, а таксама ўвагі да турызму з боку дзяржавы і грамадства, якая назіраецца ў апошні час, трэба чакаць развіцця сацыяльна - культурнай накіраванасці турызму і на Беларусі. У гэтай сувязі мэтазгодна разгледзець ролю культуры як асноўнага фактара стварэння турысцкіх матывацый і масавага далучэння турыстаў.

Турысцкую матывацыю можна вызначыць як стымул чалавека, накіраваны на задавальненне рэкрэацыйных запатрабаванняў у залежнасці ад яго індывідуальных, псіхалагічных асаблівасцей, сістэмы поглядаў, каштоўнасцей, схільнасцей, адукацыі і г.д. [2]

У свеце існуе звыш 300 відаў і падвідаў падарожжаў, якія дапаўняюцца новымі разнавіднасцямі і якія здольныя задавальняць разнастайныя запатрабаванні і жаданні турыстаў. Матываў, якімі кіруюцца турысты, шмат. Зыходзячы з мэтаў падарожжаў,іх можна класіфікаваць такім чынам:

1. Адпачынак (зняць стрэс, накоплены за нейкі перыяд часу, змяніць прыродна - кліматычныя і жыццевыя ўмовы, быць у асяроддзі іншых людзей, іншай культуры, адчуць новыя ўражанні, прыняць удзел у гульнях).

2. Пазнанне (убачыць выдатныя гістарычныя мясціны, пабудовы, з'явы прыроды, пазнаеміцца з дасягненнямі культуры, навукі, тэхнікі).

3. Забавы (наведаць атракцыены, тэматычныя і аквапаркі, вядомыя тэатры, цыркі, карнавалы, казіно, фестывалі, нацыянальныя святы,спартыўныя спаборніцтвы і гульні).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Лячэнне (аздараўленне ў якасці асноўнай мэты і як суправаджальная праграма).

5. Паломніцтва (правядзенне культавых абрадаў, самаўдасканаленне і зацверджанне духоўнага зместу, дасягненне ўнутраных канфесійных мэтаў).

Культурнае самавыяўленне народаў заўседы цікавіць. Прыродная дапытлівасць турыста ў адносінах да розных куткоў свету і іншых народаў складаюць адзін з найбольш моцных турысцкіх матываў.

Турызм - найлепшы спосаб знаемства з іншай культурай, культурай сваей краіны. У гэтым гуманістычнае значэнне турызму, якое складаецца з выкарыстання яго магчымасцей для развіцця асобы, яе творчага патэнцыялу, пашырэння адукацыйных гарызонтаў.

Імкненне да ведаў заўседы было неад'емнай рысай чалавека.Сумяшчэнне адпачынку з пазнаннем жыцця, гісторыі і культуры іншых і свайго народаў - адна з задач, якую ў поўнай меры здольны вырашыць турызм.

Даўно адасобіўся і стаў самастойным такі від турызму, як культурны, ці пазнавальны. Яго асновай з'яўляецца гісторыка - культурны патэнцыял краіны, які ўмяшчае ўсе сацыякультурнае асяроддзе з традыцыямі і звычаямі, асаблівасцямі побытавай і гістарычнай дзейнасці. Мінімальны набор рэсурсаў для пазнавальнага турызму можа даць любая мясцовасць, але для яе масавага развіцця патрабуецца некаторая канцэнтрацыя аб'ектаў культурнай спадчыны, сярод якіх можна вызначыць: помнікі археалогіі, культавую і грамадскую, ландшафтную архітэктуру, малыя і вялікія гістарычныя гарады, музеі, тэатры, выставы, аб'екты этнаграфіі, народных рамесстваў, цэнтраў прыкладнога мастацтва.

Асаблівасці культуры розных рэгіенаў усе часцей прымушаюць людзей праводзіць адпачынкі ў падарожжах. Развіцце культурных фактараў унутры рэгіена з'яўляецца сродкам пашырэння рэсурсаў для прыцягнення турысцкіх патокаў. Культурны ўзровень можа быць выкарыстаны таксама для стварэння станоўчага іміджу канкрэтнага рэгіена на турысцкім рынку. Поспех развіцця турызму залежыць не толькі ад матэрыяльна - тэхнічнай базы, якая адпавядае агульнапрынятым стандартам і патрабаванням, але і ад унікальнасці нацыянальнай культурнай спадчыны.

Розныя галіны дзейнасці здольныя выклікаць моцны матыў да падарожжаў і цікавасць да турысцкіх напрамкаў, найбольшыя з якіх - такія элементы культуры народа, як мастацтва, навука, рэлігія, гісторыя і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйна адным з прывабных элементаў мастацкай культуры з'яўляецца музычны патэнцыял рэгіена. У некаторых краінах музыка выступае як асноўны фактар прыцягнення турыстаў. Вядомыя музычныя фестывалі штогод збіраюць тысячы ўдзельнікаў. На Беларусі, на наш погляд, таксама есць падставы развіваць гэты накірунак, маюцца на ўвазе папулярныя фестывали "Славянскі базар у Віцебску", "Залаты шлягер" у Магілеве і інш.

Выяўленчае мастацтва таксама здольна фарміраваць пераканаўчы матыў да падарожжа. На Беларусі існуюць мясціны, якія могуць у гэтым накірунку прыцягваць турыстаў - Віцебск, як радзіма Марка Шагала, Здраунева (сядзіба І. Рэпіна) і г.д.

Літаратурныя помнікі рэгіена маюць больш абмежаваную ў параўнанні з іншымі элементамі культуры цікавасць, але ўсе ж такі складаюць значны турысцкі матыў і аснову арганізацыі рознабаковых турыстычных праграм і маршрутаў. Літаратурныя творы валодаюць магчымасцю складаць ураженне пра краіну і яе культуру. На Беларусі, на наш погляд, падарожжа па мясцінах вядомых дзеячоў літаратуры можа спрыяць развіццю, перш за ўсе ўнутранага турызму. Але, напрыклад, Навагрудак, як радзіма вялікага паэта Адама Міцкевіча, можа стаць прывабным экскурсійным маршрутам для суседзяў - палякаў.

Народныя рамествы, якія зроблены фабрычным ці кустарным спосабам мясцовымі майстрамі - добры напамінак пра краіну. Сення на Беларусі не адно свята не абыходзіцца без удзелу майстроў дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва, вырабы з саломкі, лазы, ганчарныя і тканныя вырабы вядомы далека за межамі нашай краіны, таму яны павінны быць даступнымі для турыстаў.

Такім чынам, культура рэгіена здольна выклікаць у патэнцыяльных турыстаў моцныя матывы да падарожжаў.Таму захаванне культурнай спадчыны і яе рацыянальнае выкарыстанне маюць відавочнае значэнне для ўстойлівага прыцягнення турысцкіх патокаў і захавання папулярнасці канкрэтнага турыстычнага напрамку.

ЛІТАРАТУРА:

1.Квартальнаў В.А. Турызм, экскурсія, абмены: сучасная практыка.- М. : Навука, 1993, с. 15.

2. Квартальнаў В.А. Турызм.: Дапаможнік. - М. : Фінансы і статыстыка, 2002, с. 97



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ